*А.М. Макарэвіч*

# ФОРМА-, СЭНСА- І СТЫЛЕЎТВАРАЛЬНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ «НЯДОЛІ ЗАБЛОЦКІХ» ЛУКАША КАЛЮГІ

Лукаш Калюга – Адам.Бабарэка – Антось Адамовіч – Лукаш Калюга – чытач... Што яднае гэтыя асобы ў адзін шэраг?

У 1929 г. створана першая частка аповесці Лукаша Калюгі "Нядоля Заблоцкіх". У 1931 г. Адам Бабарэка піша лісты Антосю Адамовічу, у якіх не толькі дзеліцца сваімі ўражаннямі па гэтым творы, а і дае глыбокі яго літаратуразнаўчы аналіз, які вызначаецца актуальнымі да сённяшняга дня высновамі аб асаблівасцях сэнса-, форма-, стылеўтварэння гэтай аповесці. У 1934 г. Антось Адамовіч перасылае напісаныя для яго лісты Адама Бабарэкі Лукашу Калюгу з наступным тлумачэннем мэты такога яго ўчынку: "*Думаю, што чытанне Адамавых заўваг дапаможа табе шмат у чым пазнаць глыбей самога сябе, а таксама і дасць некаторую апору тваім уласным поглядам на тваю творчасць і самой гэтай творчасці. Раю табе прачытаць іх удумліва і не раз*" [2, с. 560].

У сваіх творах Лукаш Калюга неаднаразова звяртаецца да ўяўляемага ім чытача яго твораў. Такія звароты прысутнічаюць і ў "Нядолі Заблоцкіх" (гутарка аб гэтым будзе далей), і ў незакончаным рамане "Пустадомкі", і ў аповесці "Дзе косці мелюць".

У перадапошняй частцы рамана "Пустадомкі" аўтар звяртаецца да ўважлівага чытача і апасродкавана прапануе яму яшчэ раз звярнуцца да вобраза Маркі Невядомчыка, на душэўныя памкненні якога, магчыма, чытач не звярнуў увагу, калі ў першы раз успрымаў гэты вобраз. Не



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

звярнуў, бо, магчыма, быў пад уражаннем тых абставін з твора, у якіх "*чалавек драбней мошкі робіцца*". А далей выйшла вунь што: *як* узвысілі драматычныя абставіны наступнага жыцця душу гэтага чалавека, выявіўшы ў ёй высокі яе гарт. Гэты зварот аўтара да чытача мэтазгодна ўспрымаць у кантэксце папярэдніх высноў з Маркавага ліста аб яго памкненнях на радзіму. Тут адлюстраваны памкненні не толькі літаратурнага героя, а і адчуванні, жаданні самога Лукаша Калюгі.

"*Таго быць не можа ...Яшчэ прайдуся па сваёй зямлі. Яна лёгкая хадзіць, а вочы прысыпаць і пагатоў – пухам!.. Калі побач з прашчурамі не пусцяць легчы, я згодзен і пад плотам – але пад сваім! З нас такіх не адзін, можа, курган завядзецца. Дзівіцца з іх будзе прышласць: што такое лютае тут было?*

*Уважлівы чытач!*

*Вам не трапілася от толькі што сустрэць Марку Невядомчыка нацянькі крадком балонку пераходзячы? – аўтар гэтага не прыкмеціў. Бачыце, так шырока – на паўсвету (дзе Марка, а дзе Берасцянская ці Маляўшчыцкая вуліца!) – заняўшы, чалавек драбней мошкі робіцца. Хто яго згледзіць, усіх упасе!..*" [1, с. 456].

Прадчуваючы незайздросны лёс сваіх твораў, Лукаш Калюга спадзяецца, што яны будуць усё ж запатрабаваны чытачом з будучага, які будзе жыць ужо "*па кручаным часе*" (пасля грамадскай завірухі, якая жорстка перакройвала лёсы людзей, бязлітасна ставячы апошнюю кропку ў іх жыцці).

"*Калі шчыра казаць, аўтару б хацелася самому на Невядомчыкавым месцы быць, ды не "Новую зямлю", а сваіх "Пустадомкаў" у пасялкоўцавых руках бачыць.*

*А можа... "Можа, калі й на наш гразкі, скапытаваны двор скіне пава залацістае пяро". І калі дзе заваляецца гэтая нішчымная мая забаўка, як тады будзе ў час. Будзе вельмі цікава ў лагодны па кручаным часе прачытаць. А пакуль што – хай ляжыць: есці не просіць. Можа, чаго далежыцца.*

*Некалі тое будзе...*" [1, с. 446].

У аповесці "Дзе косці мелюць" пісьменнік стварае вобразы ўяўляемых ім чытачоў яго твораў – бацькі і сына, якім цікава будзе "*пра кручаны час*".

"*Калі дзе заваляецца гэтая мая невялічкая забаўка, яна будзе ў час. У маладзікову, самую святую нядзельку вылезе гаспадар ад мачання з-за стала. І здыме па снядання гэту маю кніжку з трамы. Расхіне на тым мейсцы, дзе ў нейкі прысвятак на гэтым тыдні,*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*меўшы час, спыніўся быў. Сядзе на відне каля акна за ўсланы чыстым арцыбовым абрусам стол.*

*Самому яму цікава ў лагодныя дні пра кручаны час ведаць, а сыну (дармо, што ў апошнюю групу сямігодкі ходзіць) не дасць мае кніжкі ў рукі. Ён, бачыце, мал яшчэ, – думаецца бацьку, – падрасце большы – прачытае, будзе яшчэ час. Але ягоны хлапец – такі прабеглы й цікаўны – скрадзецца ды крадком, варуючыся бацькі, з тым большаю цікавасцю раней пары да гэтых балонак дабярэцца*" [1, с. 446].

Гэтыя і падобныя да іх факты з твораў Лукаша Калюгі сведчаць аб тым, што пісьменнік, які не толькі прадчуваў лёс сваіх твораў, але і прадбачыў яго ("Пустадомкі напісаны ў "*сутарэнні ў Менску – у Ірбіце на выгнанні*", 1933–1935; "Дзе косці мелюць" створаны ў высылцы), меркаваў аб (калі выкарыстаць тэрмін Ю. Борэва) *гістарычнай рухомасці* яго твораў, аб адэкватным успрыняцці іх сэнсу чытачом з будучага.

Урэшце рэшт і інтымная перапіска Лукаша Калюгі з Нінай Казлоўскай сведчыць (гэта проста-такі пульсуе між радкоў пісьменнікавых лістоў) аб тым, што ён раскрываў сваю душу не толькі перад каханай жанчынай, але і перад чытачом, да якога дойдуць (трэба меркаваць, аб гэтым думаў Калюга) і гэтыя лісты.

Удумлівага і неаднаразовага прачытання творы Лукаша Калюгі патрабуюць і зараз дзеля ўсё новага і новага адчування не толькі разбуральнага духу адлюстраванага ў іх часу, а і майстэрства пісьменніка пры мастацкім узнаўленні гэтага часу.

Падзагаловак аповесці – "Прыгоды і здарэнні" – ужо сам па сабе звяртае ўвагу на жанравую мадыфікацыю твора: апавядальная гісторыя.

Формаўтваральным цэнтрам аповесці з'яўляецца Апавядальнік, які ўзнаўляе факты і падзеі з гісторыі сям'і Заблоцкіх дзеля таго, каб паказаць, з якога асяроддзя выйшаў у свет Пархім Заблоцкі, на асобу якога звяртаецца ўвага ў самым пачатку твора.

"<...> *што ён* [Пархім. – А.М.] *быў за чалавек? Чаму так прыспела Заблоцкаму на мыле, а не на чым іншым сабе заработкі знайсці? Што яго ў гандлёўства пусціцца прымусіла? І гэта ведаць трэба канечне. Але адложым яго надалей. Скажам толькі:*

*Кожнаму Заблоцкаму прыйшлася адменная доля*" [1. с. 220].

Лагічна было б далей у творы прасачыць лёс гэтага Заблоцкага. Аднак жа калі б ні "прыходзіў" Апавядальнік разам з "*таварышам чытачом*" у госці да сям'і Юстапа Заблоцкага, Пархіма не аказвалася



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

дома, ён некуды збягаў[1]. Такім чынам, Апавядальнікава абяцанне аповеду пра Пархіма (*"Але адложым яго надалей".*) так і засталося нявыкананым: пачынаючы з шостага раздзела, Апавядальнік засяроджвае ўвагу на асобе яго брата, Савосты.

"Усюды Заблоцкіх вядомо" [1, с. 220] – такая выснова Апавядальніка з'яўляецца фармальнай прычынай звароту да аповеду пра гісторыю гэтай сям'і. Тым болей, што гісторыя гэтая вызначаецца сваёй таямнічасцю (а гэта заўсёды было прыцягальным для апавядальнікаў з народа; прыгадаем хаця б "Шляхціца Завальню..." Яна Баршчэўскага ці апавяданні М. Гарэцкага "Страшная музыкава песня", "Стары прафесар", "Дурны настаўнік" і інш.[2]), цікавымі тыпамі-характарамі, якія "нараджаюць" не менш цікавыя жыццёвыя сітуацыі, эпізоды, падзеі.

У першым раздзеле Апавядальнік прыводзіць разгорнутыя непасрэдныя характарыстыкі членаў сям'і Заблоцкіх, звяртае ўвагу на іх "адменную долю", найбольш шырокай з іх з'яўляецца характарыстыка старога Заблоцкага – Савэрына.

У другім раздзеле аб'яднаны рэтраспекцыйныя інфармацыі і эпізодавыя рэтраспекцыі з гісторыі аб тым, "як дзяліліся Заблоцкіх браты – Вінцэнты з Юстапам" [1, с. 223] і што з таго выйшла. Найбольш разгорнутай эпізодавай рэтраспекцыяй з'яўляецца тая, у якой апавядаецца аб "гары пасярод Баркаўцоў" [1, с. 223]. Апавядальнік ускосна звяртае ўвагу на тое, што ён выкарыстоўвае ў сваім аповедзе народныя паданні і выпадкі, "дзейкі", з імі звязаныя: "Асталіся ад таей даўніны ўсяго "йстужка" пра Вінцэнтага, а пра Юстапава багацце цэлае паданне, з імі разам злучыліся дзейкі і пра дзіўнае паходжанне гары пасярод Баркаўцоў <...> I не адлучыць тут праўду ад казкі" [1, с. 223, 226].

У гэтым жа раздзеле Апавядальнік звяртаецца да свайго рэцыпіента, каб той выбраў вольны час і разам з ім адышоўся у мінулае, каб прасачыць яго падзеі. Разам яны выберуць не толькі пэўны перыяд, дзень, але і частку дня

[1] Частка III: *"Двух сыноў меў Юстап. Пакінем надалей Пархіма, большага Юстапчыка. Што ты пра яго скажаш, калі ён ніколі дома не стыкаецца. Ужо год пад васемнаццаць бралася хлопцу. Увазнаў дзявочы хвартух, дык – ён на вячоркі. Толькі тады Пархім дома, як работа ёсць. <...>*

*Пакінем надалей Пархіма... Мала таго, што ніколі яго дома няма"* [1, с. 227], – заўважае апавядальнік.

Частка VIII: *"Узяў ён шапку з цвіка, жакетку з шастка ды, надзеўшы, напрануўшы, машэр на вуліцу (От удаўся валанцай! Ніколі лішняй хвіліны не забавіцца дома. Не дасць прыгледзецца, што ён за хлапец)"* [1. с. 257].

[2] Аб гэтым – Макаревич, А.Н. В разных стилевых течениях: Проблема жанра и стиля в рассказах 20-х годов М. Горецкого и Т. Гартного / А.Н. Макаревич.– Екатеринбург, 1995. – С. 28–34; Макарэвіч, А.М. Праблема жанравых мадыфікацый у беларускай прозе XIX – пачатку XX ст. / А.М. Макарэвіч. – Магілёў, 1999. – С. 14 – 34.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

з мінулага, па якім будуць вандраваць. Мэты, акрэсленыя ў гэтым звароце, у далейшым выконваюць важную форма- і сэнсаарганізуючую ролю. Форма такога звароту не была характэрнай для апавядальных гісторый ні XIX, ні XX ст., як, дарэчы, і форма ўсяго твора "Нядоля Заблоцкіх" – твора, які ў дачыненні да народных апавядальных традыцый, што выкарыстоўваліся ў мастацкай літаратуры, з'яўляецца не толькі наватарскім, але і які "дэманструе" багацце народнай апавядальнай традыцыі, яе перспектыўнасць для мастацкага асэнсавання падзей мінулага.

"*От лепей выберам калі вальнейшы час ды адыдземся назад у даўнейшае гадоў на трыццаць, самі таго дзіва паглядзім. Толькі выбірайма так, каб і ў нас вольны час быў, каб выхадны дзень прыпадаў, ды каб і ў людзей была вольная часіна: так выбірайма, каб наш выхадны дзень, а іх даўнейшае свята ці які прысвятак у адзін дзень сышліся. Гэта ж тое ведайце, мы на той бок вайны, у старую бытнасць адыходзімся. Людское свята ці прысвятак нам трэба, каб не хадзіць за патрэбнымі людзьмі па полі дый ля дому па ўсякіх заканурках, каб іх не шукаць, замінаць працавітым у рабоце, пытаючы ды шукаючы сабе добрай прыгоды, цікавага слова. Без прыгод працуюць людзі, а здараюцца прыгоды пры рабоце ўсяго ў гультая*" [1, с. 226].

У трэцім раздзеле Апавядальнік "далучае" рэцыпіента яго гісторыі – ужо ўдзельніка "*абходу*" мінулага (раз той пагадзіўся на такую "вандроўку" разам з Апавядальнікам) – у "непасрэднае" назіранне падзей мінулага. Апавядальнік прапануе свой (у адпаведнасці з яго мэтазгоднасцю адбору матэрыялу для "абходу") выбар падзей, іх удзельнікаў і інш.

"*Дык от мы сталі проці Заблоцкіх і не ведаем, што тут рабіць. Сталі перад Юстапавымі варотамі і пазіраем на Вінцэнтаў двор. Ён бяднейшы, да яго да першага трэ было б зайсці. Але як перайсці гразкую баркаўскую вуліцу на другі, ніжэйшы, гразчэйшы бок?*

*І што ж мы зробім? Маючы на Вінцэнтага за яго беднасць лепшую ўвагу, зойдзем перш да большага, шчаслівейшага яго брата, да баркаўскага багатыра Юстапа Заблоцкага. Хай за гэта будзе вінен той даўнейшы баркаўскі валасны суддзя, што пасяліў Вінцэнтага ў такім невыгодным месцы* <...>

*Двух сыноў меў Юстап. Пакінем надалей Пархіма* [гутарка пра яго пойдзе далей. – *А.М.*], *большага Юстапчыка. Што ты пра яго скажаш, калі ён ніколі дома не стыкаецца.* <...>

*Пакінем надалей Пархіма... Мала таго, што ніколі яго няма дома.*

*Як толькі свята, і ў Баркаўцох Пархіма цяжка злавіць – як звалачэцца дзе ў дзесятае сяло, дык з раніцы да вечара будзе там круціць галаву*" [1, с. 227].

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Такім чынам ствараецца эфект рэальнай прысутнасці рэцыпіента ў мінулым; ён ужо з'яўляецца не проста слухачом, але і рэальным сузіральнікам падзей мінулага. З ім Апавядальнік раіцца, да яго звяртаецца, яму нешта тлумачыць, зыходзячы з нібыта рэальнай сітуацыі, у якой яны – удзельнікі "*абходу*" мінулага – аказаліся. Прыйшлі, маўляў, у час "*абходу*" ў госці да Юстапа, а яго сына, які цікавы быў бы для "вандроўнікаў", не аказалася дома, але нічога, з ім яшчэ спаткаюцца "вандроўнікі", зараз жа трэбаназіраць тое, што можна бачыць. У выніку ствараецца умоўна рэальны план падзей "падарожжа" ("*абходу*") ад адной сям'і Заблоцкіх да другой[3].

Калі-нікалі Апавядальнік звяртае ўвагу на першапачатковых носьбітаў інфармацыі аб тых падзеях, якія ён прапаноўвае "*таварышу чытачу*", – гаваркая Кацярына [1, с. 266], Шамручыха [1, с. 269]. Але ў большасці выпадкаў Апавядальнік выступае даволі дасведчаным у адносінах да гісторыі сям'і Заблоцкіх; ствараецца такое ўражанне, што ўсё з гэтых падзей ён назіраў непасрэдна, асэнсоўваў іх неаднойчы – таму яны ў такой іх падрабязнасці засталіся ў яго памяці.

[3] Некаторыя з прыкладаў стварэння Апавядальнікам такога ўмоўна рэальнага плана падзей "падарожжа":

*"Няма чаго нам больш бавіцца ў гэтай хаце. Ведаем ужо Савостава маленства, Юстапава п'янства і Прузынінага непрыяцеля: ненавідны "курч" – і даволі з нас"* [1, с. 231].

*"Не спяшаймася ў хату. Заўнімемся крыху на Вінцэнтавым гразкім двары. Пастаім тут ды на меншага, бяднейшага Заблоцкага пакоі паглядзім <...>*

*Нагінайцеся, нагінайцеся, таварыш чытач! Не надта хаджаламу чалавеку ссадзіць сабе лабэціну ў Вінцэнтавых нізкіх дзвярах. У тры-чатыры пагібелі згінайцеся тут, бо з паклонам:*

*– Дзіньдобры! – Вінцэнтаму Заблоцкаму і Разэлі Заблоцкай трэба даць.*

*І ў хату зайшоўшы, не рассядайцеся надта, не раскідайце на бакі шырока, не выцягуйце наперад далёка сваіх цыбатых – калі яны ў вас такія – ног, бо цесна будзе. Вы ж не захочаце, можа, у столь галавою ўпёршыся стаяць, прастарнейшае сабе ў гэтай цеснай хаце выбраўшы месца, бо, калі крыху завысокі, і тут нагнуцца давядзецца"* [1, с. 232].

*"З дваіма віталіся, першы раз адчыніўшы ў гэту хату нізкія дзверы. З траіма цяпер развітвацца давялося: з Вінцэсем, з Вінцэсіхаю ды з малым Юлікам-самасейкам.*

*– Бывайце здаровы, жывеце вясёлыя! Пабылі б болей. Не ганьбуем вашай нізкай, цеснай хаты. Але няма часу. І так доўга забавіліся... За гэтыя гады, што мы з вамі ганьдзюрылі, падгадаваў меншага свайго сына Юстап Заблоцкі. Ужо гэты год мае ён выправіць яго ў школу. Дык от зойдзем да іх паглядзець: ці не здарыцца там, часам, якога здарэння.*

*Калі дзе гадоў колькі забавімся, няма чаго гэтага шкадаваць. Не далей ад дому, а бліжэй пад дом, пад свой час, усё бяромся мы"* [1, с. 243].

*"Выбачайце, таварыш чытач. Можа, вам і няйзручна цягацца за маімі абрыджонымі героямі ўслед. Куды яны толькі не звалакуцца?! От як цяпер Савосце: у такую гразкую мясціну ён нас завёў! <...> Дрэнна вам, таварыш чытач, ісці за маімі героямі следам – сам гэта ведаю, але нічога іншага парадзіць не магу – дрэнна, калі вы, часамі, у чаравіках. Сапсуеце дарэшты свой абутак <...>"* [1, с. 245].

Іншыя прыклады стварэння эфекту рэальнай прысутнасці "таварыша чытача" ў падарожжы праз звароты да яго на падставе праяў рэтраспекцыйнай рэчаіснасці, якую прапануе паназіраць Апавядальнік, можна знайсці ў: [1, с. 232, 246, 251, 265, 256, 277, 282 і інш.].

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

"*Абход*" Апавядальніка і "*таварыша чытача*" напоўнены эпізодавымі рэтраспекцыямі, рэтраспекцыйнымі інфармацыямі, якія чаргуюцца, гарманічна далучаючыся адна да другой; яны ў іх сукупнасці ўзвышаюцца (пераважаюць) над фактамі "*абходу*" (разважаннямі Апавядальніка, яго прапановамі, меркаваннямі і інш). У сувязі з гэтым прыгадаем Апавядальнікаву прапанову: "*От лепей* <...> *адыдземся назад у даўнейшае гадоў на трыццаць* <...>" [1, с. 226]. Аднак жа і гэтае "*даўнейшае*" дапаўняецца рэтраспекцыйнымі эпізодамі, рэтраспекцыйнымі інфармацыямі, непасрэднымі (часцей) і апасродкаванымі характарыстыкамі, якія спрыяюць узнікненню эфекту пераканальнасці, праўдзівасці ўзнаўляемых падзей, – так паступова паўстае форма рэтраспекцыі ў рэтраспекцыі. Рэтраспекцыйныя эпізоды, інфармацыі з'яўляюцца не толькі дапаўненнямі да экспазіцыі, а і важнымі сэнсаўтваральнымі складальнікамі "падарожжа", мэта якога прасачыць жыццё сем'яў Заблоцкіх у яго трыццацігадовай даўнасці. На самай жа справе ствараюцца рэтраспекцыі-навелы (ад другога і да шостага раздзелаў) аб паказальных эпізодах з жыцця Заблоцкіх. Ад адной да другой з іх і вандруюць апавядальнік з "*таварышам чытачом*".

Пачынаючы з шостага раздзела[4], стыль аповеду мяняецца: падзейныя сітуацыі вызначаюцца падрабязнасцю дзеянняў, аўтарскіх каментарыяў, заўваг, дыялогавай насычанасцю, адлюстроўваюцца перажыванні літаратурных герояў, уводзяцца пейзажныя апісанні, для мовы характэрна вобразнасць. Часавая працягласць падзей даволі шырокая, але пры гэтым яны (падзеі) лагічна, нязмушана яднаюцца паміж сабой – стыль набывае прыкметы размеранай (павольнай) апавядальнай плыні. І тут ранейшы стыль рэтраспекцыйнага падарожжа знікае, саступаючы месца адлюстраванню падзей праз рэальны мастацкі свет, у якім падзеі развіваюцца ўжо "самі па сабе" (а не паводле адбору іх Апавядальнікам), аб'ядноўваючыся ў сюжэтна арганізаваны рух. Ствараецца эфект падпарадкавання першапачатковых мэт Апавядальніка плыні жыцця, якое ў гісторыі сям'і Заблоцкіх на першы план вылучае асобу Пархіма.

Гэтыя часткі аповесці ўяўляюць сабой спалучэнне навел з падзейна-разгорнутым апавяданнем.

Такім чынам, "Нядоля Заблоцкіх" у жанравых адносінах уяўляе сабой аповесць, жанравая мадыфікацыя яе – апавядальная гісторыя, у межах жа жанравай мадыфікацыі (у адпаведнасці з мэтамі Апавядальніка, сюжэтным рухам і адпаведнай яго стылёвай рэалізацыяй) адбываецца

[4] Фабульны рух тут можна акрэсліць наступным чынам: дашкольнае дзяцінства Савосты, яго сутычкі з Клёмкам Філончыкам; узаемаадносіны настаўніка Зубрыцкага, бацькоў Пархіма Заблоцкага і самога Пархіма ў сувязі з яго вучобай у школе і Хлюпскім гарадскім вучылішчы; пошукі Пархімам шляхоў у новы свет пасля яго адлічэння з вучылішча, таварышаванне з Клёмкам Філончыкам на радзіме і ў чужыне, вяртанне дадому з "*чужой стараны*".



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

формаўтваральнае перакрыжаванне: навела / падзейна-разгорнутае апавяданне. Прычым у форме жанравай мадыфікацьні навела дамінуе. Лішейна гэта можна прадставіць наступным чынам: **аповесць** /// *апавядальная гісторыя* // **навела** \ падзейна-разгорнутае апавяданне (формаўтваральная структура аповесці і яе жанравыя асаблівасці прадстаўлены ў дадатках).

Такое жанравае формаўтварэнне з'яўляецца сведчаннем наступных асаблівасцей мастацкага асваення рэчаіснасці Л. Калюгам у гэтым творы.

Па-першае, зварот Л. Калюгі да традыцыйнай народнай формы апавядання аб мінулым (апавядальная гісторыя[5]) у спалучэнні з арыентацыяй аўтара на наватарства пры адлюстраванні рэчаіснасці дазволіў пісьменніку стварыць новую, невядомую раней для беларускай літаратуры форму аповесці. Гэта з'яўляецца сведчаннем плённага спалучэння традыцыйнага і наватарскага ў творчасці маладога пісьменніка, сведчаннем пазітыўнай перспектыўнасці такога напрамку ў творчым шляху пісьменнікаў-узвышэнцаў, да ліку якіх належаў Л. Калюга.

Гэтая форма цікавая не толькі сваёй незвычайнасцю для тагачаснай літаратуры. Яна, акрамя іншага, прадэманстравала пазітыўныя перспектывы развіцця новых буйных жанравых форм у літаратуры пры выкарыстанні традыцыйных народных апавядальных форм. Гэта дазваляла выпрацоўваць стыль новых жанравых форм як аднаго з праяў стылю новай мастацкай літаратуры, якая імкнецца да мастацкага эксперыменту, наватарства.

Па-другое, для такой новай літаратурнай формы аўтар мусіў выпрацоўваць адпаведны стыль, які вызначаецца яго ўстойлівасцю, мэтазгоднасцю, на перспектыву ўспрыняцця верагоднасцю.

Па-трэцяе, пры ўсім адзначаным раней станоўчым назіраюцца негатыўныя праяўленні ў творы, звязаныя з парушэннем логікі развіцця падзей (не рэалізавана заяўка на адлюстраванне лёсу Пархіма Заблоцкага), твор перанасычаны рэтраспекцыямі, якія часам перашкаджаюць аўтару заглыбляцца ў раскрыццё характараў яго герояў.

## Літаратура:


1. *Калюга, Л.* Творы / Л. Калюга. – Мінск: Маст. літ., 1992. – 607 с.
2. Лісты Адама Бабарэкі пра "Нядолю Заблоцкіх" / А. Бабарэка // Калюга Л. Творы. – Мінск: Маст. літ., 1992. – С. 561 – 571.
3. *Шарапава А.* Аповесць Лукаша Калюгі "Нядоля Заблоцкіх": спецыфіка адлюстравання рэчаіснасці / А.В. Шарапава // VI Навуковыя чытанні,


[5] А. Шарапава *"акрэслівае жанравую спецыфіку гэтага твора як апавядальную гісторыю аповесцевай будовы з магічна-рэалістычным зместам"*, адносячы "Нядолю Заблоцкіх" у адпаведнасці з наратыўнай тыпалогіяй І. Фюгера да *"аўктарыяльна-дырэктарыяльнага тыпу (знешняя пазіцыя + асабовая граматычная форма + пераважныя веды) аўктарыяльнай наратыўнай формы"* [2, с. 340].



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

прысвечаныя 120-годдзю з дня нараджэння акадэміка НАН Беларусі С.М. Некрашэвіча: Зб. навук. арт. / гал. рэд. А.А. Станкевіч. – Гомель: УА "ГДУ імя Ф. Скарыны", 2003. – С. 337 – 340.

## Жанравыя асаблівасці аповесці "Нядоля Заблоцкіх"




## Формаўтваральная структура аповесці "Нядоля Заблоцкіх"




Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова